БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

Аб'ект аўтарскага права
УДК 82.0:821.161.3 «19/20»

ТАРАСАВА
Святлана Мікалаеўна

# ЖАНРАВАЯ ДЫНАМІКА І ТЫПАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭМЫ КАНЦА XX – ПАЧАТКУ XXI СТ.

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія

Мінск, 2024

Навуковая работа выканана ва УА
«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

Навуковы кіраўнік: **Мельнікава Зоя Пятроўна,**
доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры беларускай філалогіі філалагічнага факультэта УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Афіцыйныя апаненты: **Гараднiцкі Яўген Андрэевіч,**
доктар філалагічных навук, дацэнт, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

**Мішчанчук Ірына Мікалаеўна,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры філалагічнага факультэта УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Апаніруючая арганізацыя: УА "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"

Абарона адбудзецца 17 мая 2024 г. у 12.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; e-mail вучонага сакратара tsidorova1980@mail.ru; тэл.вучонага сакратара 8 (017) 209-55-58

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «3» 04 2024 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый Сідарава Т.П.

# УВОДЗІНЫ

Праблемы жанралогіі заўсёды знаходзіліся ў полі ўвагі даследчыкаў. Без рашэння праблем жанравага развіцця складана раскрыць сутнасць і спецыфіку літаратурнага працэсу.

Паэма як жанр заўсёды вылучалася гнуткасцю формы, сінкрэтызмам, гатоўнасцю да абнаўлення. Яна прызнана жанрам неардынарным, дынамічным, што і з'яўляецца прычынай дыскусійных і часам катэгарычных пазіцый шэрагу навукоўцаў. У тэорыі літаратуры станаўленне і развіццё жанравых канонаў вылучаецца ў асобную даследчую праблему, што дазваляе элімінаваць вывучэнне жанравых структур беларускай паэмы з жанрава-стылёвай цэласнасці адзінкавых, канкрэтных мастацкіх твораў, абраных матэрыялам для літаратуразнаўчага аналізу.

**Актуальнасць дадзенага даследавання** абумоўлена шырокай распаўсюджанасцю ў беларускай літаратуры такой мастацкай з'явы, як паэма – жанру, які налічвае не адно стагоддзе. Беларуская паэма прайшла шлях ад класічных некананічных твораў да сучаснага жанрава-эстэтычнага абнаўлення, відавочных фармальных і змястоўных змен.

У беларускім літаратуразнаўстве, нягледзячы на наяўнасць фундаментальных даследаванняў паэмы (М. Лазарук, М. Арочка), адсутнічае разгляд набыткаў беларускага пісьменства ў названым жанры на сучасным этапе, недастаткова распрацаваны тэарэтычныя пытанні, звязаныя з праблемамі тыпалогіі і жанравай дыфузіі сучасных твораў паэмнага жанру.

Наспела аб'ектыўная неабходнасць прааналізаваць жанравую спецыфіку беларускай паэмы канца XX – пачатку XXI стагоддзя, тэарэтычна абгрунтаваць сувязь з эстэтыкай і паэтыкай сучаснага літаратурнага працэсу ў кантэксце ідэйна-эстэтычных пошукаў Новай літаратурнай сітуацыі (Г. Кісліцына) мяжы стагоддзяў. Актуальнасць дадзенага даследавання вызначаецца неабходнасцю выявіць тэндэнцыі развіцця паэмнага жанру, вызначыць спецыфіку і тыпалогію сучаснай беларускай паэмы, адзначыць заканамернасці, якія ўплываюць на дынаміку жанравых форм паэтычнага эпасу.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне выканана на кафедры беларускай філалогіі ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» ў межах навукова-даследчай тэмы «Літаратурная Гарадзеншчына», зацверджанай саветам філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» (пратакол № 11 ад 22.12.2021), Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя, культура, грамадства,

дзяржава». Дысертацыя адпавядае прыярытэтным напрамкам фундаментальных навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2021–2025 гг. (п. 6 «Забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства, дзяржавы»; Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.05.2020 № 156).

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта даследавання – устанавіць заканамернасці развіцця і функцыянавання жанру беларускай паэмы канца XX – пачатку XXI стагоддзя, распрацаваць удакладненую жанравую тыпалогію.

Мэта рэалізуецца праз вырашэнне наступных задач:

1) адзначыць базавыя характарыстыкі паэмы як літаратурна-паэтычнага жанру, выявіць этапы яго развіцця ў айчынным пісьменстве;

2) распрацаваць комплексную мадэль крытэрыяў для вызначэння тыпалагічных прыкмет жанру паэмы;

3) абгрунтаваць дамінанты развіцця жанру і спецыфіку жанравага мыслення аўтараў, тыпалагічныя рысы беларускай паэмы ў літаратуры канца XX – пачатку XXI стагоддзя;

4) устанавіць віды класічных некананічных жанравых форм паэмы, вызначыць стратэгіі выяўлення аўтарскай пазіцыі;

5) вылучыць жанравыя рысы ў эксперыментальных формах міжжанравых унутрылітаратурных і фальклорна-літаратурных мадыфікацый сучаснай беларускай паэмы.

**Аб’ект даследавання** – паэтыка беларускай паэмы канца XX – пачатку XXI стагоддзя.

**Прадмет даследавання** – дынаміка жанру, тыпалогія сучаснай паэмы, стратэгіі жанравага мыслення, міжжанравыя ўнутрылітаратурныя і фальклорна-літаратурныя мадыфікацыі, выяўленне аўтарскай пазіцыі.

У працэсе даследавання рэалізаваны гісторыка-генетычны, параўнальна-тыпалагічны метады, задзейнічаны герменеўтычны падыход, элементы структурнага аналізу твора, сістэмна-функцыянальны метад даследавання.

**Навуковая навізна**

У рабоце пададзены сістэмны аналіз паэтыкі сучаснай беларускай паэмы, прапанавана комплексная мадэль крытэрыяў (КМК) для вызначэння тыпалагічных прыкмет названага жанру. Упершыню ўстаноўлена жанравая тыпалогія твораў паэмнага жанру ў беларускай літаратуры канца XX – пачатку XXI стагоддзя, вызначаны іх эстэтычна-жанравыя заканамернасці і дамінанты. Упершыню ў айчынным літаратуразнаўстве выяўлены і ахарактарызаваны жанравыя віды некананічных і эксперыментальных форм сучаснай паэмы, разгледжаны жанравыя разнавіднасці ліра-эпічнай, лірычнай, драматычнай

паэмы, абгрунтаваны ўнутрылітаратурныя і фальклорна-літаратурныя міжжанравыя мадыфікацыі паэмы. Для далейшай рэалізацыі прапануюцца наступныя тэрміналагічныя азначэнні: *лірыка-наратыўная паэма, наратыўна-маналагічная паэма, ролева-маналагічная паэма, міфалагічна-рамантычная паэма, умоўна-гістарычная паэма.*

Матэрыялам даследавання сталі творы паэмнага жанру Г. Бураўкіна, Р. Барадуліна, А.Бязлепкінай, Н. Гілевіча, Ю. Голуба, С. Грахоўскага, С. Давідовіча, А. Дэбіша, В. Жыбуля, А. Дуброўскага-Сарочанкава, А. Кавалеўскага, Л. Кебіч, В. Макарэвіча, М. Мятліцкага, А. Мінкіна, А. Разанава, Л. Рублеўскай, М. Пракаповіча, І. Снарскай, А. Спрынчан, В. Яраца і інш.

Даследаванне твораў гэтых і некаторых іншых аўтараў дае магчымасць шырэй і глыбей асэнсаваць літаратурны працэс канца XX стагоддзя і перыяду найноўшай літаратуры, дазваляе ўстанавіць заканамернасці і спецыфіку жанравага абнаўлення беларускай паэмы.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Паэма займае адно з вядучых месцаў у жанравым полі беларускай літаратуры ад старажытнага часу да сучаснага моманту. У ходзе гісторыка-эстэтычнай эвалюцыі беларуская паэма праявіла сябе як дынамічны, зменлівы жанр, у якім базавымі характарыстыкамі застаюцца адзнакі яе жанравага канону: эпічная інтэнцыйнасць, канцэнтраванасць выяўлення, увага да кульмінацыйных эпахальных момантаў. Вылучаныя ў дысертацыі этапы развіцця паэмы пацвярджаюць наяўнасць у айчыннай літаратуры разнастайных жанрава-відавых мадэляў. На этапе канца XX і пачатку XXI стагоддзяў паэма працягвае функцыянаваць у арыгінальных жанравых мадыфікацыях.

2. Жаналогія сучаснай паэмы ўстанаўліваецца праз комплексную мадэль крытэрыяў, утворанай з устойлівых прыкмет жанру (наратыўнасць; ідэйна-сэнсаваю канцэптуальнасць; міжродавы сінтэз; поліканфліктнасць; поліфанізм, эматыўнасць тэксту мастацкага твора) і яго варыятыўных адзнак (сінтэтызм формы, эклектычнасць; шматаспектнасць, асацыятыўнасць, умоўна-сімвалічны характар вобразнай сістэмы).

3. Вызначальнымі тыпалагічнымі рысамі сучаснай беларускай паэмы з'яўляюцца: праблемна-тэматычная разнастайнасць, ускладненасць хранатопа, дыфузнасць жанравых форм, наяўнасць шматузроўневай сістэмы мастацка-эстэтычных сродкаў, арыентаванасць жанравага мыслення і паэтыкі на эксперымент. Прысутнасцю ў сучаснай літаратуры традыцыйнай і авангарднай парадыгмаў абумоўлены працэс міжродавага і міжжанравага ўзаемадзеяння ў беларускай паэме, што дазваляе вылучыць на мяжы XX –XXI стагоддзяў два

жанрава-тыпалагічныя комплексы – класічныя некананічныя і эксперыментальныя формы паэмы.

4. Класічная некананічная паэма ўяўляе сабой жанравую форму, якая з'яўляецца ўзорам міжродавага ўзаемадзеяння з дамінантай эпічнага або лірычнага ці драматычнага пачатку ў творы і характарызуецца сінтэзам розных родавых уласцівасцей. Беларуская класічная некананічная жанравая форма прадстаўлена відамі ліра-эпічнай, лірычнай і драматычнай паэм, кожная з якіх утварае свой комплекс жанравых разнавіднасцей. Наяўнасць названых разнавіднасцей сведчыць аб захаванні ў беларускай літаратуры жанравай традыцыі і аб яе абнаўленні на этапе Новай літаратурнай сітуацыі.

5. Змены ў сучаснай жанравай сістэме літаратуры абумовілі з'яўленне новых мадыфікацый паэмы, утвораных шляхам кантамінацыі разнастайных жанравых кампанентаў. Эксперыментальныя формы сучаснай беларускай паэмы выяўляюць два прадуктыўныя тыпы ўзаемадзеяння – міжжанравае ўнутрылітаратурнае ўзаемадзеянне і фальклорна-літаратурнае. Утвораныя ў выніку жанравыя мадыфікацыі набываюць адзнакі постмадэрнісцкай паэтыкі, у тым ліку літаратурнай гульні, дыялагічнасці, эклектычнасці, уласцівых творам Новай літаратурнай сітуацыі.

Сучасная беларуская паэма – сінтэзаваны жанр, які абумоўлены рознымі ўзроўнямі літаратурнага і сацыякультурнага ўзаемадзеяння. Камбінаторнасць тэм і жанраў, стылявая разнастайнасць, універсалізацыя выяўлення – адметныя рысы сучаснай паэмы.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені ў выніку дысертацыі з адмежаваннем іх ад сааўтараў сумесных даследаванняў і публікацый**

Дысертацыя ўяўляе сабой самастойнае тэарэтыка-аналітычнае даследаванне, выкананае аўтарам самастойна ў поўным аб'ёме. Усе артыкулы напісаны без суаўтараў.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Вынікі даследавання абмяркоўваліся на 26 міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях: Рэспубліканскіх Купалаўскіх чытаннях (г. Гродна, 3–6 кастрычніка 1995 г.; 25–27 лістапада 1997 г.; 25–26 лютага 2010 г.; 9 кастрычніка 2015 г.; 24 лістапада 2017 г.; 15 лістапада 2019 г.; 26 лістапада 2021 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Literatura i języki słowian wschodnich: stan obecny i tendencje rozwojowe» (г. Аполе, 24–26 верасня 1996 г.); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Актуальныя праблемы беларускага літаратуразнаўства» (г. Магілёў, 25–26 сакавіка 1999 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Język, literatura i kultura słowian: dawniej

і dziś – III» (г. Познань, 23–25 верасня 1999 г.); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Актуальныя праблемы выкладання мовы і літаратуры ў вышэйшай і сярэдняй школе» (г. Гродна, 16 красавіка 2004 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Гісторыка-тэарэтычныя актуаліі беларускай сучаснай філалогіі», прысвечанай 70-годдзю з дня нараджэння А. А. Майсейчыка (г. Брэст – в. Гошчава Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці, 3 лістапада 2006 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Фальклор і сучасная культура» (г. Мінск, 22–23 красавіка 2008 г.); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «VII Рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні» (г. Брэст, 15 снежня 2009 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце» (г. Віцебск, 21–22 кастрычніка 2010 г.; 19–20 лістапада 2015 г.); XVII і XX Міжнародных навуковых канферэнцыях «Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności» (г. Гродна, 18–19 лістапада 2010 г.; 23–24 кастрычніка 2014 г.); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Канцэптуальныя падыходы да рэалізацыі зместу філалагічнай адукацыі ў школе і ВНУ» (г. Брэст, 5 красавіка 2011 г.; 14 лістапада 2013 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Куляшоўскія чытанні» (г. Магілёў, 24–25 красавіка 2014 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Жанравая дынаміка і вобразны свет беларускай літаратуры XX – пачатку XXI стагоддзя» (г. Брэст, 26 кастрычніка 2017 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуская гістарычная літаратура: жанры, характары, праблемы (да 125-годдзя М. Гарэцкага)» (г. Мінск, 22–23 сакавіка 2018 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Дзясятыя Калеснікаўскія чытанні» (г. Брэст, 18 кастрычніка 2018 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Польска-беларускія літаратурныя і моўныя сувязі» (г. Варшава, 16–17 сакавіка 2019 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу» (г. Брэст, 20 лістапада 2019 г.; 17 лістапада 2021 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «XI Калеснікаўскія чытанні» (г. Брэст, 29 кастрычніка 2020 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Нацыянальна-культурны кампанент у літаратурнай і дыялектнай мове» (г. Брэст, 12 лютага 2021 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Францыск Скарына і наш час», прысвечанай 95-годдзю з дня нараджэння прафесара У. В. Анічэнкі (г. Гомель, 25 лютага 2022 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «XII Калеснікаўскія чытанні», прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння У. А. Калесніка (г. Брэст, 28 кастрычніка 2022 г.).

Па выніках праведзенага даследавання аформлены 2 акты ўкаранення ў навучальны працэс установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» (Дадатак А).

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі**

Па тэме дысертацыі апублікавана 48 артыкулаў (агульны аб'ём 16,2 аўт. арк.), у ліку якіх 7 артыкулаў у навуковых выданнях, якія адпавядаюць п. 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь (3,7 аўт. арк.), 16 артыкулаў у зборніках навуковых прац (5,5 аўт. арт.), 21 – у матэрыялах канферэнцый (6,7 аўт. арк.), 4 – у іншых выданнях (0,3 аўт. арк.).

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох раздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі 152 старонкі. Тэкст дысертацыі складае 116 старонак.

Бібліяграфія змяшчае 431 пазіцыю і займае 32 старонкі, дадаткі – 5 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У Главе 1 ***«Тыпалогія паэмы як прадмет сучаснага літаратуразнаўства»*** аргументуецца актуальнасць праблемы паэмнай жаналогіі і тыпалогіі сярод іншых тэарэтычных пытанняў сучаснага літаратуразнаўства. Глава складаецца з трох раздзелаў.

У раздзеле 1.1 **«Паэма як літаратурна-мастацкі жанр»** праведзены аналітычны агляд жанравых прыкмет паэмы, якія змяшчаюць аўтарытэтныя даведачныя выданні «Литературная энциклопедия: Словарь литературных терминов», «Словарь литературоведческих терминов», «Литературный энциклопедический словарь» і інш. Канстатуюцца існуючыя пазіцыі, што паэма – гэта сінтэзаванае жанравае ўтварэнне, якое вылучаецца манументальнасцю, узнёслай, патэтычнай трактоўкай сюжэта, вобразаў, тэмы, прыўзнятасцю мовы. Дадзеныя жанравыя прыкметы паэмы не дазваляюць правесці дакладных межаў паміж паэмай і вершаваным апавяданнем, раманам у вершах або лірычным цыклам. Відавочна, што вылучаныя папярэднімі пакаленнямі навукоўцаў жанравыя характарыстыкі паэмы з-за абмежаванасці крытэрыяў не з'яўляюцца вычарпальнымі для вывучэння і тыпалагізацыі разнаякасных сучасных паэмных тэкстаў.

Літаратуразнаўства ХХ стагоддзя зрабіла значны крок у напрамку вывучэння паэмы як жанру, пра што сведчаць шматлікія даследаванні, прадстаўленыя навукоўцамі розных краін. Пытанням генезісу, ідэйна-эстэтычных адметнасцей паэмы прысвечаны працы рускіх даследчыкаў, што з'явіліся ў 60–70-я гады ХХ стагоддзя, такіх як А. Беразнева, А. Банкетаў, М. Зубкоў, А. Лур'е, Г. Чарвячэнка, Л. Швяцова. Увагу да жанру паэмы і яе эвалюцыі ва ўкраінскай літаратуры праявілі В. Іванісенка, П. Сярдзюк, М. Гнацюк, А. Каспрук. На старонках «Литературной газеты», часопісаў «Вопросы литературы», «Дружба народов», «Литературное обозрение» ў 60-я

гады XX стагоддзя ішлі дыскусіі, прысвечаныя паэме: што такое жанр паэмы, якія яе спецыфічныя рысы, перспектывы гэтага жанру? Меркаванні ўдзельнікаў дыскусіі былі рознымі ў вызначэнні крытэрыяў азначэння жанру, які акрэсліваўся то залішне шырока, то, наадварот, звужана: часцей за ўсё абсалютызаваўся адзін родавы элемент – эпічны або лірычны.

Заканамерна выглядае з'яўленне новых даследаванняў, прысвечаных паэме ў 80-я гады XX стагоддзя. Тэарэтычныя аспекты паэмы разглядаліся ў працах расійскіх даследчыкаў А. Жакава, С. Каваленка, А. Карпава, В. Рэдзькіна, Л.Спясіўцавай.

Менавіта ў 80–90-я гады XX стагоддзя да напрацовак расійскіх даследчыкаў паэмы далучыліся набыткі навукоўцаў, што распачалі даследаванні жанру паэмы ў нацыянальных літаратурах. Разгляд ідэйна-тэматычнага плану твораў паэмнага жанру прадстаўлены ў працах Н. Мазепы «Развитие современной советской поэмы», Л. Скірды «Громадянськість сучасної української поеми». Жанравы аспект паэмы апынуўся ў полі ўвагі Б. Мельнічука, Л. Дзем'янiўскай, якія даследавалі функцыянаванне і стан драматычнай паэмы ў творчасці ўкраінскіх пісьменнікаў, а таксама В. Кіканса ў працы «Современная советская поэма». У кнізе літоўскага даследчыка Р. Пакальнішкіса «Литовская поэма: Основные жанровые формы» тлумачэнне генезісу паэмы звязваецца з узаемадзеяннем розных родавых пачаткаў, іх сінтэзам, што складае сутнасць паэмы як самастойнага жанру.

Праведзены аналіз даследаванняў па праблеме дэфініцыі паэмы пераконвае: паэму варта разглядаць як асобы сінтэзаваны жанр, як адметную мастацка-вобразную сістэму, якая ўключае ў сябе структурныя рысы розных жанравых традыцый, што дынамічна і ў розных варыяцыях узаемадзейнічаюць паміж сабой.

У раздзеле 1.2 **«Гісторыя і жанравая эвалюцыя беларускай паэмы ў даследаваннях айчынных літаратуразнаўцаў»** аналізуецца ступень тэарэтычнай распрацоўкі жанру паэмы ў беларускім літаратуразнаўстве.

Агляд навуковых прац даследчыкаў XIX – пачатку XX стагоддзя (Р. Падбярэскі, М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі), у якіх надаецца ўвага пытанням аўтарства твораў, ідэйна-эстэтычнага зместу, дазволіў канстатаваць, што менавіта на гэтым этапе была закладзена аснова гісторыка-літаратурнага вывучэння жанру паэмы ў беларускім літаратуразнаўстве.

Выяўлена, што літаратуразнаўцы першай паловы XX стагоддзя У. Самойла, А. Навіна, А. Вазнясенскі, Я. Шарахоўскі, І. Замоцін, А. Бабарэка, М. Байкоў, М. Ларчанка ўпершыню цэласна прааналізавалі паэмы класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, разгледзелі гісторыю іх стварэння, сюжэтна-кампазіцыйную будову, адзначылі рысы эпічнасці.

У працах беларускіх навукоўцаў другой паловы XX стагоддзя І. Баса, М. Мушынскага, Л. Смальянавай, М. Лазарука, М. Арочкі ўзноўлена дастаткова поўная карціна генэзісу і эвалюцыі паэмы ў беларускай літаратуры, дакладна вызначана роля паэм Янкі Купалы, Якуба Коласа, У. Дубоўкі і іншых пісьменнікаў у ідэйна-эстэтычным узбагачэнні гэтага жанру. Важна, што навукоўцы разглядалі беларускую паэму ў аспектах тыпалагічнага параўнання з творамі іншых літаратур.

На мяжы XX – XXI стагоддзяў у публікацыях беларускіх вучоных з'яўляюцца новыя аспекты вывучэння разглядаемага жанру: развіццё беларускай драматычнай паэмы прадстаўлена ў працах Г. Харошкі, пытанні генезісу, жанравай спецыфікі лацінамоўнага ліра-эпасу разгледжаны ў працах Ж. Некрашэвіч-Кароткай, сваю аўтарскую расшыфроўку змястоўнага поля класічных паэм Якуба Коласа падаў у сваіх публікацыях І. Жук.

У кантэксце дадзенага даследавання мэтазгодна вылучыць шэраг гістарычных этапаў развіцця беларускай паэмы, у кожным з якіх выяўляюцца пэўныя тэндэнцыі і ўласцівасці жанру, адбываецца станаўленне яго мастацка-стылёвых прыкмет:

1 этап. Станаўленне жанру паэмы (эпоха ранняга Рэнесансу): паэмы М. Гусоўскага «Песня пра зубра», Я. Вісліцкага «Пруская вайна».

2 этап. Росквіт лацінамоўнай паэмы Беларусі (канец XVI – першая палова XVII стагоддзяў): паэмы Я. Радвана «Радзівіліяда», Х. Завішы «Караламахія» і інш.

3 этап. Актывізацыя жанравага пошуку ў беларускай паэме (XIX стагоддзе): парадыйна-сатырычныя паэмы В. Равінскага, К. Вераніцына, паэмы В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча.

4 этап. Узнікненне новых жанравых відаў паэмы (пачатак XX стагоддзя): паэмы Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Багдановіча.

5 этап. Ускладненне жанравай прыроды паэмы (20–30-я гады XX стагоддзя): паэмы Якуба Коласа, У. Дубоўкі, Язэпа Пушчы, Міхася Чарота.

6 этап. Актуалізацыя жанравых прыкмет эпічнай паэмы (40–50-я гады XX стагоддзя): паэмы П. Броўкі, А. Куляшова, Максіма Танка.

7 этап. Актывізацыя ліра-эпічнай, лірычнай, драматычнай паэмы (60-я– першая палова 80-х гадоў XX стагоддзя): паэмы А. Куляшова, В. Зуёнка, Р. Барадуліна.

8 этап. З'яўленне новых жанравых мадыфікацый паэмы (канец XX – пачатак XXI стагоддзя): творы А. Разанава, Э. Акуліна, В. Жыбуля.

У раздзеле 1.3 **«Тыпалогія сучаснай паэмы: комплексная мадэль крытэрыяў»** даводзіцца актуальнасць пытання тыпалогіі паэмы, якому надавалася ўвага ў працах даследчыкаў А. Сакалова, М. Зубкова, І. Неўпакоевай, А. Васількоўскага, М. Лазарука, М. Арочкі, А. Каспрука,

Л. Спясіўцавай. Гэтыя навукоўцы вылучылі значную колькасць паэмных жанравых разнавіднасцей, прымаючы пад увагу гнуткасць і зменлівасць мастацкай формы паэмы на канкрэтным гістарычным этапе, што і стварыла праблему яе тыпалогіі.

Прапануецца наступнае азначэнне жанру:

**Паэма – гэта літаратурна-паэтычны жанр, ідэйна-зместавую аснову якога складае сюжэтна-разгорнутае адлюстраванне падзей, лёсаў, пачуццяў герояў і эмацыйнае ўвасабленне аўтарскага пафасу праз шматузроўневую паэтыку, сістэму вобразаў.**

Для тыпалагічнай характарыстыкі паэмы прапануецца **комплексная мадэль крытэрыяў** (КМК) – вызначальных кампанентаў, якія складаюцца з устойлівых прыкмет жанру і яго варыятыўных адзнак.

Да ліку ўстойлівых прыкмет паэмы як жанру трэба адносіць:

1) наратыўнасць, ідэйна-сэнсавую канцэптуальнасць;
2) міжродавы сінтэз;
3) поліканфліктнасць;
4) поліфанізм, эматыўнасць тэксту мастацкага твора.

Варыятыўнымі адзнакамі паэмы трэба лічыць:

1) сінтэтызм формы, эклектычнасць;
2) шматаспектнасць, асацыятыўнасць, умоўна-сімвалічны характар вобразнай сістэмы.

Прапанаваная КМК дазваляе вырашаць праблемы ўнутрыжанравай класіфікацыі паэмы, праводзіць тыпалогію твораў паэмнага жанру, прагназаваць магчымыя напрамкі развіцця і функцыянавання паэмы ў новых літаратурных умовах.

У Главе 2 ***«Жанравая тыпалогія беларускай паэмы мяжы XX – XXI стагоддзяў»,*** якая складаецца з двух раздзелаў, шматаспектна даследуецца паэтыка жанру паэмы ў гісторыка-культурных рэаліях канца XX – пачатку XXI стагоддзя, акрэсліваюцца жанравыя межы, матыўнае поле, праблематыка, вобразна-тэматычныя дамінанты твораў.

У раздзеле 2.1 **«Беларуская паэма ў гісторыка-літаратурным кантэксце канца 80–90-х гадоў XX стагоддзя»** праведзены аналіз шэрагу паэм беларускіх пісьменнікаў, у якіх знайшлі адбітак асноўныя тэндэнцыі Новай літаратурнай сітуацыі: ідэйнае абнаўленне зместу, актыўны пошук новых форм выяўлення («Узнясенне» Г. Бураўкіна, «Удакладненні да асабовага лістка па ўліку партызанскіх кадраў» Р. Барадуліна, «Лодачкі» Н. Гілевіча, «Карчма» Ю. Голуба, «Балючая памяць» С. Грахоўскага, «Партызанскі праспект» С. Давідовіча).

Выяўлена, што з'явіліся новыя жанравыя формы, інтэнсіўна абнаўляецца паэтыка паэмы. Акрэслены тры этапы развіцця беларускай паэмы канца XX стагоддзя, якія фіксуюць тэндэнцыі жанру ў новых умовах:

- актывізацыя сатырычнай плыні ў жанры паэмы ў перыяд 1980 – 1986 гадоў;
- вяртанне ў літаратурны працэс страчаных або забароненых раней твораў паэмнага жанру, зварот да паказу трагедыйных момантаў нацыянальнай гісторы («лагерная», чарнобыльская, ваенная тэма), з'яўленне новых жанравых мадэляў паэмы ў перыяд 1987 – 1995 гадоў;
- выхад на новы філасофска-эстэтычны ўзровень гістарычнай паэмы, далучэнне да літаратурнага працэсу беларускіх пісьменнікаў замежжа ў перыяд 1996 – 2000 гадоў.

У раздзеле 2.2 **«Жанравае мысленне ў беларускай паэме пачатку XXI стагоддзя»** ўстаноўлена, што жанравая мабільнасць паэмы, скіраванасць аўтараў як на традыцыйныя набыткі, так і на паэтычны эксперымент прэзентуюць самыя разнастайныя спосабы паэтычнага ўзнаўлення рэчаіснасці і выяўляюць выхад жанру на новы ўзровень асэнсавання жыцця, гісторыі, асобы і свету.

Заўважана, што ва ўмовах дыфузнага стану сучаснага літаратурна-жанравага поля паэма выявіла рухомасць і адкрытасць сваёй структуры, не страціўшы пры гэтым вызначальных, кананічных жанравых адзнак. Суіснаванне ў сучаснай літаратуры традыцыйнай і авангарднай парадыгмаў дало падставы для далейшага тэарэтыка-аналітычнага вывучэння жанру паэмы ў названым рэчышчы, дзе выразна вылучаюцца «традыцыйны» і «авангардны» тыпы мыслення.

Шэраг сучасных аўтараў творча рэалізуюць традыцыйную парадыгму і арыентуюцца на эстэтычныя набыткі ў жанры паэмы пісьменнікаў-класікаў. Гэты напрамак прадстаўляюць паэмы М. Арочкі, Г.Бураўкіна, Я. Янішчыц, М. Мятліцкага і інш. Авангардную парадыгму прадстаўляюць паэмы Р. Барадуліна, А. Разанава, Э. Акуліна, В. Аколавай, В. Жыбуля, А. Спрынчан і іншых, якія імкнуцца да ўласна-творчага абнаўлення паэтыкі.

Аналіз зместу і паэтыкі твораў беларускіх аўтараў канца XX – пачатку XXI стагоддзя дазваляе канстатаваць, што пісьменнікі, якія рэалізуюць традыцыйную парадыгму, аддаюць перавагу некананічным жанравым відам: ліра-эпічнай паэме (паэмы «Апалены золак» М. Мятліцкага, «Подзвіг Скарыны» В. Жуковіча, «Запалі лучыну, маці» Л. Кебіч), лірычнай паэме («Жбан і вада» В. Слінко, «Новае неба» А. Дуброўскага-Сарочанкава, «Дзве зімы» В. Макарэвіча, «Там, дзе сівізна нябёс» В. Яраца) або драматычнай паэме («Amor ardens» Л. Рублеўскай, «Суд Алаізы» В. Коўтун).

Названыя віды ўтвараюць адметны корпус твораў – *класічныя некананічныя формы паэмы*. Іх характэрнай класіфікацыйна-жанравай адзнакай з'яўляецца тое, што паэтыка і стыль узаемадзейнічаюць на родавым узроўні, выяўляючы тую ці іншую родавую дамінанту.

Другі корпус твораў утвараюць *эксперыментальныя формы паэмы*. Яны выяўляюць рысы мастацкага эксперымента як у форме, так і ў змесце. Іх спецыфіку вызначаюць не родавыя, а асобныя жанравыя адзнакі, што абумоўліваюць утварэнне своеасаблівай сінтэтычнай формы. Такі мастацка-стылявы сінтэз назіраецца ў паэмах Р. Барадуліна «Слухаючы мора», Э. Акуліна «Шлях да Радзімы», «Кацёл клёцак» В. Жыбуля, «Такі час» А. Бязлепкінай.

У рэчышчы сучаснай эксперыментальнай паэмы можна вылучыць наступную *тыпалогію*: паэмы, дзе выяўлена міжжанравае ўнутрылітаратурнае ўзаемадзеянне, і паэмы з дамінантай фальклорна-літаратурнага ўзаемадзеяння. Да твораў першага тыпу варта аднесці паэмы Я. Сіпакова «Одзіум», У. Завальнюка «Так хацеў Бог!», В. Аколавай «Палачанка Ігрэна, або вяртанне Скарыны». Паэмы другога тыпу прадстаўляюць творы В. Зуёнка «Лукам'е», Н. Гілевіча «А дзе ж тая крынічанька», Р. Барадуліна «Блакада», Л. Кебіч «Одум пра песню», М. Пракаповіча «На кругі свае». Такі падзел дазваляе не толькі ўстанавіць спецыфіку кожнага жанравага ўтварэння паэмы, але і вызначыць агульныя тэндэнцыі развіцця паэмы ўцэлым і жанравай сістэмы літаратуры ўвогуле.

Глава 3 ***«Класічныя некананічныя формы паэмы»*** складаецца з трох раздзелаў, у якіх разглядаюцца мадэлі асноўных відаў паэмы: ліра-эпічнай, лірычнай і драматычнай паэм.

У раздзеле 3.1 **«Ліра-эпічная паэма: спецыфіка аўтарскага самавыяўлення»** аналізуюцца жанравыя ўласцівасці твораў, у якіх дамінуе сюжэтна-апавядальная плынь.

Паводле статусу наратара ў мастацкім свеце ліра-эпічнай паэмы можна вылучыць наступныя тыпалагічныя мадэлі названага жанру: 1) *лірыка-наратыўную* паэму (паэмы «Матчын двор» В. Макарэвіча, «Няходжанае поле», «Чмяліны мёд», «Апалены золак» М. Мятліцкага); 2) *наратыўна-маналагічную паэму* (паэмы «Цень» А. Бадака, «Балючая памяць» С. Грахоўскага, «Хатыні вечныя званы» С. Давідовіча, «Чорная быль» С. Законнікава); 3) *ролева-маналагічную паэму* («Рагнеда» І. Снарскай, «Касцюшкава прысяга» У. Саламахі).

У названых разнавіднасцях ліра-эпічнай паэмы выяўляюцца яе характэрныя адзнакі: лаканічнасць сюжэту, спалучэнне апавядальнай і лірычнай плыні, наяўнасць вобразу апавядальніка, які прадстаўлены ў розных пазіцыях («Er-Erzähler», «Ich-Erzähler», «Du-Erzählung» (В. Шміт)). У творах

сучасных аўтараў заўважаны новыя ўласцівасці паэтыкі – асацыятыўнасць мыслення, імкненне да мастацкага сінтэзу, ускладненне хранатопных форм.

У раздзеле 3.2 **«Лірычная паэма ў сучаснай жанравай сістэме»** праведзены тэкстуальны аналіз паэм наступных жанравых разнавіднасцей: *абагульнена-лірычнай* («Шлях не дадому» А. Кавалеўскага, «Няміга» К. Камейшы), *лірыка-публіцыстычнай* («Дзве зімы» В. Макарэвіча, «Там, дзе сівізна нябёс» В. Яраца), *лірыка-псіхалагічнай* («Маргарыта» А. Гібок-Гібкоўскага, «Прага любові» В. Максімовіча, «Верацяно халоднага лета» А. Спрынчан), *лірыка-медытатыўнай* («Вытокі рэха» В. Яраца, «Як дагарае свечка» А. Мінкіна, «Паэма першага позірку» А. Гуцава). Устаноўлена, што кожная мадэль характарызуецца як тыпалагічна блізкімі адзнакамі (аслабленая фабула, арыентацыя на адлюстраванне пачуццёвага свету героя, шматаспектнасць перажыванняў, асацыятыўнасць), так і рысамі, адпаведнымі канкрэтнай разнавіднасці. Сімволіка-метафарычны план характэрны для абагульнена-лірычнай паэмы, лірыка-публіцыстычная паэма вылучаецца асобым адборам эстэтычных сродкаў паэтыкі, у лірыка-псіхалагічнай паэме на пярэдні план выступае эмацыянальна-псіхалагічны пачатак, лірыка-медытаўную паэму адрознівае мера філасофскага пранікнення ў сутнасць прадмета.

У раздзеле 3.3 **«Сучасная драматычная паэма: праблема тыпалогіі»** даследуюцца жанрава-стылёвыя асаблівасці драматычнай паэмы на матэрыяле твораў беларускіх пісьменнікаў мяжы XX і XXI стагоддзяў.

Адзначана, што драматычная паэма – від некананічнай класічнай формы паэмы, у якой сінтэзуюцца ў сваёй аснове драматычны, лірычны і эпічны пачаткі.

Заўважана, што жанр драматычнай паэмы функцыянуе на ўсіх асноўных этапах беларускай літаратуры. Несумненна, што знакавы ўплыў на спецыфіку названага жанру аказвае сучасны гісторыка-літаратурны кантэкст мяжы стагоддзяў. Гэтым тлумачыцца наяўнасць дзвюх тыпалагічных разнавіднасцей драматычнай паэмы: *міфалагічна-рамантычнай паэмы* («Уваскрэсенне Іуды» А. Дэбіша, «Плыт» Л. Дранько-Майсюка, «Апошнія гастролі Агасфера» Л. Рублеўскай) і *ўмоўна-гістарычнай паэмы* (паэмы «Князь Вітаўт» А. Дударава, «Суд Алаізы» В. Коўтун, «Amor ardens» Л. Рублеўскай, «Януш, альбо Апошні беларус з роду Радзівілаў», «Рэгіна» Я. Хвалея). Аснову дадзенай класіфікацыі складае ідэйная і матыўна-сюжэтная спецыфіка твораў.

Аналітычнае даследаванне стану драматычных паэм дазваляе зрабіць наступную выснову: гэта самастойная жанравая форма, якая характарызуецца ўласнымі жанравымі адзнакамі (дыялагічная форма, востры ідэйны канфлікт, перавага дынамікі пачуццяў, перажыванняў над дынамікай дзеяння,

эматыўнасць, схільнасць аўтара да філасофскага абагульнення, паэтычная ўмоўнасць).

Устаноўлена: на сучасную беларускую драматычную паэму паўплывалі працэсы, народжаныя Новай літаратурнай сітуацыяй: дыфузнасць, эклектычнасць, шматзначная асацыятыўнасць.

Глава 4 ***«Эксперыментальныя формы паэмы»*** складаецца з двух раздзелаў і прысвечана даследаванню твораў паэмнага жанру на новым этапе эвалюцыйнага развіцця, што стварае навуковае ўяўленне аб жанравых мадыфікацыях, утвораных шляхам міжжанравага сінтэзу.

У раздзеле 4.1 **«Міжжанравыя ўнутрылітаратурныя мадыфікацыі паэмы»** канстатуецца, што беларускія пісьменнікі, звяртаючыся да жанру паэмы, выяўляюць імкненне выкарыстаць усе жанравыя і родавыя магчымасці літаратуры, з’яднаць у мастацкай прасторы сучаснай паэмы элементы разнастайных літаратурных стыляў. Устаноўлена, што ў паэтыцы сучаснай эксперыментальнай паэмы важную ролю адыгрываюць элементы іншых літаратурных жанраў і жанравых форм – эсэ, казання, фантасмагорыі, фрэскі, акраверша, паліндрома і інш.

Заўважана: вызваляючыся ад замацаваных у паэмнай традыцыі жанравых стэрэатыпаў, сучасныя творцы пад уплывам знешніх і ўнутраных фактараў дастаткова вольна абыходзяцца з кананічнымі рысамі паэмы. У ёй захоўваюцца жанравыя дамінанты, што ніяк не пярэчаць змestава-фармальным эксперыментам, наадварот, ствараюцца эстэтычныя ўмовы для фарміравання новых жанравых мадыфікацый. Гэта выяўлена ў міжжанравых унутрылітаратурных тыпах *паэмы-эсэ* («Слухаючы мора» Р. Барадуліна), *паэмы-фрэскі* («Смаргонская акадэмія» Р. Барадуліна), *сімволіка-філасофскай паэмы* (паэмы А. Разанава «Рагвалод» і «Усяслаў Чарадзей»), *акрапаэмы* (паэма «Шлях да Радзімы» Э. Акуліна), *паэмы-паліндрома* (паэмы «Рогі гор», «Кацёл клёцак», «Палігон ног і лап» В. Жыбуля), *паэмы-манаверша* («Такі час» А. Бязлепкінай).

Названыя з’явы знайшлі ўвасабленне і ў драматычных паэмах В. Аколавай «Нарачанскія песні любові», «Палачанка Ігрэна, або вяртанне Скарыны», паэмах у прозе Я. Сіпакова «Ахвярны двор», «Одзіум». Літаратурная гульня, эклектычнасць, іранічны характар аповеду становяцца рысамі эксперыментальных паэм.

Тэксты беларускіх аўтараў, створаныя шляхам унутрылітаратурнага сінтэзу, якія рэпрэзентуюць эксперыментальную разнавіднасць сучаснай паэмы, нязменна захоўваюць рысы канона – суб’ектыўную мастацкую рэальнасць, сюжэтную канцэптуальнасць, сацыяльна-псіхалагічную насычанасць. Рэалізацыя прыёмаў сумежных жанраў, іх мастацкі сінтэз

дапаўняюць і ўзбагачаюць паэтыку паэмы разнастайнымі відамі ўмоўных і экспрэсіўных сродкаў выяўлення.

У раздзеле 4.2 **«Фальклорна-літаратурнае жанравае ўзаемадзеянне ў каноне сучаснай паэмы»** даследуецца спецыфіка мадыфікаванай паэмы, калі прадстаўлены іншы тып узаемадзеяння – фальклорная «цытатнасць». Пранікненне фальклорных элементаў і асобных жанраў у мастацкую структуру паэмы сведчыць аб наяўнасці новых жанравых мадыфікацый, такіх, як *паэма-паданне* («Вяртанне нарачанкі» М. Мятліцкі), *фальклорна-міфалагічная паэма* (паэмы «Жыцень» Л. Дранько-Майсюка, «Стрый і Опер» Л. Кебіч).

Фальклорна-літаратурнае ўзаемадзеянне ў жанры сучаснай паэмы значна паскорыла працэс абнаўлення традыцыйных жанравых форм, у якіх праявіліся новыя жанравыя адзнакі: сімволіка-алегарычная вобразнасць, эклектычнасць, паліфанізм.

Падкрэслена, што імкненне творцы спалучыць жанравыя і родавыя магчымасці фальклору і літаратуры з'яўляецца характэрнай прыкметай дынамічнасці паэмы. Гэта натуральна прыводзіць да пашырэння патэнцыялу жанру, які мае магчымасць ўзбагачацца за кошт названага ўзаемадзеяння. Разуменне спецыфікі гэтых працэсаў дазваляе аспрэчыць распаўсюджанае меркаванне аб знікненні ці крызісе паэмы і сцвердзіць думку аб рухомасці, трансфармацыях і патэнцыяльных выяўленча-эстэтычных магчымасцях жанру.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. На розных этапах развіцця беларуская паэма застаецца самадастатковым жанрам і з'яўляецца важным складнікам літаратурнага працэсу. Агляд яе гісторыі дазволіў вылучыць шэраг знакавых этапаў: 1 этап. Станаўленне жанру паэмы (эпоха ранняга Рэнесансу); 2 этап. Росквіт лацінамоўнай паэмы Беларусі (канец XVI – першая палова XVII стагоддзяў); 3 этап. Актывізацыя жанравага пошуку ў беларускай паэме (XIX стагоддзе); 4 этап. Узнікненне новых жанравых відаў паэмы (пачатак XX стагоддзя). 5 этап. Ускладненне жанравай прыроды паэмы (20–30-я гады XX стагоддзя); 6 этап. Актуалізацыя жанравых прыкмет эпічнай паэмы (40–50-я гады XX стагоддзя); 7 этап. Актывізацыя ліра-эпічнай, лірычнай, драматычнай паэмы (60-я – першая палова 80-х гадоў XX стагоддзя); 8 этап. З'яўленне новых жанравых мадыфікацый паэмы (канец XX – пачатак XXI стагоддзя).

Згаданыя перыяды дэманструюць пераўтварэнні ў жанравай сістэме паэмы, абумоўленыя заканамернасцямі паэтыкі мастацкай мадальнасці, у

перыяд якой адбываецца інтэнсіўная трансфармацыя кананічных жанраў у некананічныя.

Гэты працэс знайшоў працяг і ў Новай літаратурнай сітуацыі канца ХХ і пачатку ХХІ стагоддзя: беларуская паэма захоўвала жанравы канон і адначасова пераўтваралася, набывала рысы новых ідэйна-эстэтычных плыняў. У сучаснай беларускай паэме базавымі характарыстыкамі застаюцца адзнакі яе жанравага канону: эпічная інтэнцыйнасць, канцэнтраванасць выяўлення, увага да кульмінацыйных эпахальных момантаў. Пад уплывам ідэйна-эстэтычных запытаў сацыякультурных і літаратурных працэсаў жанр паэмы працягвае эстэтычна эвалюцыянаваць, функцыянаваць у арыгінальных жанравых мадыфікацыях [6; 12; 17; 28; 32; 36; 39; 45].

2. Трансфармацыі, што адбыліся на апошніх этапах развіцця паэмы, патрабуюць карэкціроўкі вызначальных паняццяў, звязаных з азначэннем названага жанру. Паэма характарызуецца намі як літаратурны паэтычны жанр, ідэйна-зместавую аснову якога складаюць: сюжэтна-разгорнутае адлюстраванне падзей, лёсаў, пачуццяў герояў; эмацыйнае ўвасабленне аўтарскага пафасу праз шматузроўневую паэтыку, сістэму вобразаў. Спасціжэнне спецыфікі сучаснай паэмы аргументавана ажыццяўляецца праз рэалізацыю комплекснай мадэлі крытэрыяў (КМК), утворанай кампанентамі устойлівых прыкмет жанру паэмы і яго варыятыўных адзнак, якія праяўляюць сябе толькі ў асобных жанравых мадыфікацыях. Да ўстойлівых прыкмет паэмы адносяцца наратыўнасць, ідэйна-сэнсавая канцэптуальнасць; міжродавы сінтэз; поліканфліктнасць; поліфанізм, эматыўнасць. Да варыятыўных адзнак, якія абумоўліваюць эвалюцыю паэмы, варта аднесці сінтэтызм формы, эклектычнасць; шматаспектнасць, асацыятыўнасць, умоўна-сімвалічны характар вобразнай сістэмы. У варыятыўных адзнаках паэмы фіксуецца ўплыў на спецыфіку жанра актуальных ідэйна-эстэтычных напрамкаў і іх паэтык [6; 13; 18; 45].

3. Жанр паэмы набыў асаблівую актуальнасць у літаратурным працэсе канца ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя ў перыяд Новай літаратурнай сітуацыі, для якой характэрна дынаміка жанрава-эстэтычных эксперыментаў, перакадзіроўка родава-жанравай паэтыкі, узмацненне мадальнасці, хранатопавай умоўнасці, метафарычнасці, асацыятыўнасці, індывідуальнай эстэтыкі наратыўнасці. Многія паэмы набываюць рысы постмадэрнісцкага дыскурсу. У новых гісторыка-літаратурных абставінах канца ХХ стагоддзя беларуская паэма характарызуецца абноўленай ідэйна-эстэтычнай парадыгмай, праблемна-тэматычнай разнастайнасцю, апавядальна-хранатопавым ускладненнем,

зваротам да выяўлення розных сфер чалавечага быцця: сацыяльнай, духоўнай, філасофскай. Развіццё беларускай паэмы на дадзеным этапе засведчыла наяўнасць заканамерных тэндэнцый, характэрных для літаратуры названага часу (паэмы «Балючая памяць» С. Грахоўскага, «Таймыр» П. Пруднікава, «Удакладненні да асабовага лістка па ўліку партызанскіх кадраў» Р. Барадуліна, «Партызанскі праспект» С. Давідовіча, «Чорная быль» С. Законнікава, «Шлях на Галгофу» В. Лукшы).

Літаратурны працэс пачатку XXI стагоддзя паўплываў на дынаміку і эвалюцыю паэмнага жанру, што праявілася на яе зместавым і фармальным узроўнях. Сучасную паэму вылучае інтэлектуальная насычанасць, паліфанізм, пашырэнне лірычнага выяўлення, увага да ўнутранага жыцця асобы, філасафічнасць, якія абумоўлены зваротам да новых спосабаў выяўлення і стварэння эксперыментальных форм. Сінтэз эпікі, лірыкі і драмы абумовіў ўзнікненне адметнага тыпу паэмы, які залежыць ад аднаго з арганізуючых родавых пачаткаў, – класічнай некананічнай жанравай формы (паэмы «Няходжанае поле» М. Мятліцкага, «Развітанне» Г. Бураўкіна, «Карчма» Ю. Голуба). Другі тып – абумоўлены іншымі, пераважна, постмадэрнісцкімі спосабамі ўзаемадзеяння – склалі эксперыментальныя формы паэмы (паэмы «Слухаючы мора» Р. Барадуліна, «Одзіум» Я. Сіпакова, «Шлях да Радзімы» Э. Акуліна, «Кацёл клёцак» В. Жыбуля) [1–3; 8; 9; 13–16; 18; 19; 25; 26; 29; 33; 35; 37; 40; 41].

4. Этап мяжы XX – XXI стагоддзя ў развіцці жанру паэмы дазваляе выявіць прадуктыўнасць утварэння новых жанравых форм праз родавае ўзаемадзеянне, вынікам якога сталі віды класічнай некананічнай формы: ліра-эпічная паэма, лірычная паэма, драматычная паэма.

Ліра-эпічная паэма – твор з дамінантай сюжэтна-апавядальнай плыні. Станаўленне дадзенага віду адбывалася пад уплывам лацінамоўных паэм XVI стагоддзя. Названы жанр знайшоў творчае ўвасабленне ў класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа. Для названых мадэляў ліра-эпічнай паэмы характэрны лаканічны сюжэт, раскрыццё падзей і асоб праз ацэнку і ўспрыманне лірычнага героя, спалучэнне апавядальнай і лірычнай плыняў, наяўнасць аўтара-апавядальніка. Асаблівы статус наратара ў сучаснай ліра-эпічнай паэме дазваляе выявіць тры яе асноўныя разнавіднасці: лірыка-наратыўную паэму; наратыўна-маналагічную паэму; ролева-маналагічную паэму. У сучаснай ліра-эпічнай паэме праяўляюцца і рысы постмадэрнісцкай паэтыкі (паэмы «Подзвіг Скарыны» В. Жуковіча, «Матчын двор»

В. Макарэвіча, «Чмяліны мёд», «Апалены золак» М. Мятліцкага, «Рагнеда» І. Снарскай).

Станаўленне лірычнай паэмы ў беларускай літаратуры адбывалася пад уплывам працэсу лірызацыі, які атрымаў пашырэнне ў літаратуры пачатку ХХ стагоддзя. Названы від выявіў запатрабаванасць і здольнасць да адаптацыі ў новых літаратурных абставінах канца ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя. Лірычную паэму вылучаюць наяўнасць сюжэта, пабудаванага на аснове пачуццяў, перажыванняў героя, спавядальны, маналагічны характар лірычнага апавядання, узмоцненая аўтарская рэфлексія, эмацыйна-асацыятыўны пачатак. На сучасным этапе ў лірычнай паэме праявіліся чатыры разнавіднасці – абагульнена-лірычная паэма («Шлях не дадому» А. Кавалеўскага); лірыка-публіцыстычная («Дзве зімы» В. Макарэвіча); лірыка-медытатыўная «Як дагарае свечка» А. Мінкіна); лірыка-псіхалагічная паэмы («Верацяно халоднага лета» А. Спрынчан).

Абнаўленне паэтыкі сучаснай літаратуры аказала ўплыў і на жанравую спецыфіку драматычнай паэмы. Ідэйная і матыўна-сюжэтная спецыфіка твораў дазваляе выявіць наступныя яе разнавіднасці: міфалагічна-рамантычную паэму і ўмоўна-гістарычную паэму. У іх рэпрэзентавана адметная, уласна аўтарская мадэль свету, дзе спалучаюцца гістарычна-аб’ектыўнае і лірычна-суб’ектыўнае, будзённа-звыклае і быційна-вечнае. Аўтары часта ўвасабляюць светапоглядную сутнасць нацыянальнага быцця, выкарыстоўваючы гістарычны матэрыял, фальклорна-міфалагічную паэтыку. Характэрнымі прыкметамі жанру драматычнай паэмы з’яўляюцца: дыялагічная форма, вострая канфліктнасць, перавага дынамікі пачуццяў, перажыванняў над дынамікай дзеяння, эматыўнасць, схільнасць аўтара да філасофскага абагульнення, паэтычная ўмоўнасць, сімвалічнасць, міфалагічнасць (паэмы «Князь Вітаўт» А. Дударава, «Суд Алаізы» В. Коўтун, «Amor ardens» Л. Рублеўскай, «Януш, альбо Апошні беларус з роду Радзівілаў», «Рэгіна» Я. Хвалея, «Уваскрэсенне Іуды» А. Дэбіша). Драматычная паэма на сучасным этапе вылучаецца адкрытасцю да фармальных эксперыментаў [4; 7; 11; 13; 14; 20; 22; 34; 38; 46; 47; 48].

5. Аб’ектыўныя заканамернасці развіцця літаратуры перыяду канца ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя, уплыў паэтыкі постмадэрнізма, а таксама суб’ектыўныя фактары прадвызначылі ўзнікненне новых жанравых мадыфікацый паэмы, якія правамоцна назваць эксперыментальнымі формамі. Такія творы выключаюць традыцыйна разгорнуты сюжэт, нясуць у сабе яркую вобразнасць, метафарычнасць, элементы гульні, ужыванне творчых прыёмаў, характэрных для іншых жанраў. Вынікам міжжанравага літаратурнага

ўзаемадзеяння варта прызнаць з’яўленне паэмы-паліндрома («Кацёл клёцак» В. Жыбуля), паэмы-манаверша («Такі час» А. Бязлепкінай), акрапаэмы («Шлях да Радзімы» Э. Акуліна), паэмы ў прозе («Одзіум» Я. Сіпакова), паэмы-додзінсі-рэмэйка (паэма «Буслан і Жабміла»). Адметнымі ўласцівасцямі такога тыпу твораў становяцца літаратурная гульня, эклектычнасць паэтычнай тканіны, адсутнасць традыцыйнага лірызму, татальны характар іроніі, рэвізія літаратурнай традыцыі.

З’яўляецца прадуктыўным і другі тып міжжанравага ўзаемадзеяння – фальклорна-літаратурны. Найбольш частая форма выяўлення такога ўзаемадзеяння ў творах паэмнага жанру – фальклорная «цытата». Фальклорныя элементы ў паэмах беларускіх пісьменнікаў выконваюць важную жанраўтваральную функцыю. Яны садзейнічаюць мастацкай рэалізацыі такіх мадыфікацый, як паэма-паданне («Вяртанне нарачанкі» М. Мятліцкага), фальклорна-міфалагічная паэма (паэмы «Жыцень» Л. Дранько-Майсюка, «Стрый і Опер» Л. Кебіч). Сінтэз фальклорных і літаратурных традыцый на сучасным этапе ўзбагачае паэтыку паэмы новымі прыёмамі ўмоўна-экспрэсіўных сродкаў выразнасці.

Наяўнасць розных відаў і відавых мадыфікацый паэмы ў творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў дазваляе разглядаць гэты жанр як складаную і дынамічную сістэму, якая працягвае сваё развіццё [5; 10; 21; 23; 24; 27; 30; 31; 42–44].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны ў якасці тэарэтычнага і практычнага матэрыялу ў лекцыйных і спецыяльных курсах пры выкладанні літаратуры, пры стварэнні навучальных дапаможнікаў па гісторыі беларускай літаратуры і тэорыі літаратуры, пры напісанні курсавых і дыпломных прац, падрыхтоўцы навукова-метадычных дапаможнікаў для філалагічных факультэтаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Матэрыялы даследавання могуць стаць асновай для факультатыўнага курса «Беларуская паэма» пры выкладанні беларускай літаратуры ў школе, спецкурсаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі.

На аснове работы былі распрацаваны заняткі па прадмеце «Гісторыя беларускай літаратуры XX – пач. XXI ст.», аб чым сведчыць акт укаранення ў вучэбны працэс (акт № 03-8 / 007 ад 17.03.2023 аб укараненні вынікаў дысертацыйнай працы Тарасавай С. М. у выглядзе дадатковага матэрыялу для лекцыйных заняткаў (раздзел «Сучасная літаратура Беларусі (з сярэдзіны 80-х гадоў)» тэмы 4.28 «Жанравыя пошукі ў рэчышчы сучаснай паэмы») для

студэнтаў 4 курса дзённай формы навучання спецыяльнасці 1-21 05 01 «Беларуская філалогія»); падрыхтаваны вучэбны матэрыял для курса «Методыка выкладання беларускай літаратуры», аб чым сведчыць акт укаранення ў вучэбны працэс (акт № 03-8 / 008 ад 17.03.2023 аб укараненні вынікаў дысертацыйнай працы Тарасавай С. М. у выглядзе дадатковых матэрыялаў і заданняў для практычных заняткаў (раздзел «Асновы методыкі выкладання» тэмы 1.11 «Тэхналогія перспектыўных ліній пры вывучэнні жанру паэмы»), лекцыйных заняткаў (раздзел «Вывучэнне літаратуры на ўроку» тэмы 2.8 «Вывучэнне ліра-эпічных твораў») для студэнтаў 2 курса дзённай формы навучання спецыяльнасці 1-21 05 01 «Беларуская філалогія»); распрацаваны метадычныя матэрыялы для ўрокаў беларускай літаратуры па вывучэнні твораў паэмнага жанру .

Манаграфія па заяўленай тэме можа стаць камерцыйным прадуктам.

Напрацоўкі і тэарэтычныя вывады дысертанта садзейнічаюць далейшай распрацоўцы праблем жаналогіі беларускай літаратуры.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ


**Артыкулы ў навуковых выданнях, якія адпавядаюць п. 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь**

1. Тарасава, С. Тэматычна-жанравая своеасаблівасць паэм Яна Чыквіна / С. Тарасава // Białorutenistyka Białostocka / Uniwersytet w Białymstoku ; redaktor naczelny: H. Twaranowicz. – Białystok, 2011. – Т. 3. – С. 199–208.

2. Тарасава, С. «Не змоўк раней я і не змоўкну…»: мастацкае асэнсаванне тэмы рэпрэсій у паэмах беларускіх паэтаў / С. Тарасава // Białorutenistyka Białostocka / Uniwersytet w Białymstoku ; redaktor naczelny: H. Twaranowicz. – Białystok, 2013. – Т. 5. – С. 281–287.

3. Тарасава, С. Сакралізацыя вобразу Радзімы ў творчасці беларускіх пісьменнікаў Польшчы / С. Тарасава // Białorutenistyka Białostocka. – 2014. – Т. 6. – С. 223–232.

4. Тарасава, С. Вывучэнне твораў паэмнага жанру з выкарыстаннем тэхналогіі перспектыўных ліній (на прыкладзе паэм Янкі Купалы «Курган» і Максіма Танка «Люцыян Таполя») / С. М. Тарасава // Беларуская мова і літаратура. – 2018. – № 2 (126). – С. 31–34.

5. Тарасава, С. Жанравая прырода паэм у творчасці беларускіх пісьменнікаў канца ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя (на прыкладзе аўтараў Беларусі і Польшчы) / С. Тарасава // Acta Albaruthenica. – 2018. – Т. 18. – С. 149–159.

6. Тарасава, С. Праблема тыпалогіі паэмы ў літаратуразнаўстве і крытыцы / С. Тарасава // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Сер. 3. Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2018. – № 2. – С. 24–33.

7. Тарасава, С. Лірычная паэма ў сучаснай паэтычнай сістэме: жанравая дынаміка / С. Тарасава // Полымя. – 2020. – № 2. – С. 105–114.

**Артыкулы ў зборніках навуковых прац**

8. Тарасава, С. Біблейскія матывы ў жанры паэмы / С. Тарасава // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, ГрДУ імя Янкі Купалы, Ін-т гісторыі НАНБ ; рэдкал.: С. В. Марозава [і інш.]. – Гродна, 2008. – С. 405–411.

9. Тарасава, С. Матыў палявання ў творах беларускіх пісьменнікаў паэмнага жанру / С. Тарасава // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: І. В. Жук, У. І. Каяла. – Гродна, 2009. – С. 362–366.

10. Тарасава, С. Жанравыя мадыфікацыі сучаснай паэмы: спроба тыпалагізацыі / С. Тарасава // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : зб. навук.

арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: У. І. Каяла (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2010. – С. 390–395.

11. Тарасава, С. Жанравая своеасаблівасць паэмы Людмілы Рублеўскай «Amor ardens» / С. Тарасава // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: Д. М. Лебядзевіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2015. – С. 131–137.

12. Тарасава, С. Жанр паэмы як аб’ект у навукова-даследчых працах школьнікаў / С. Тарасава // Працы кафедры беларускай літаратуры : навук. зб. / ГрДУ імя Я. Купалы ; пад рэд. Д. М. Лебядзевіча. – Гродна, 2015. – Вып. ІІ. – С. 73–79.

13. Тарасава, С. Жанравая своеасаблівасць паэмы «Чорная быль» С. Законнікава / С. Тарасава // Працы кафедры беларускай літаратуры : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я. Купалы ; пад рэд. Д. М. Лебядзевіча. – Гродна, 2016. – Вып. ІІІ. – С. 74–80.

14. Тарасава, С. Матыў загубленага дзяцінства ў паэмах беларускіх пісьменнікаў пра Чарнобыль / С. Тарасава // Дзясятыя Танкаўскія чытанні (да Года культуры ў Беларусі) : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. Д. Старычонак (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 333–337.

15. Тарасава, С. Пераадоленне лёсу: з жыцця і творчасці Пятра Бітэля / С. Тарасава // Філалагічнае краязнаўства Гродзеншчыны (матэрыялы і даследаванні) : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я. Купалы ; рэдкал.: М. А. Даніловіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2017. – Вып. 6 : Да 125-годдзя з дня нараджэння Зоські Верас. – С. 188–192.

16. Тарасава, С. Трагічнае аблічча эпохі: тэма рэпрэсій ў паэмах беларускіх пісьменнікаў / С. Тарасава // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні (да 135-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы) : зб. навук. прац / рэдкал.: А. С. Садоўская (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2017. – С. 231–235.

17. Тарасава, С. Асаблівасці вывучэння твораў паэмнага жанру на ўроках беларускай літаратуры / С. Тарасава // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі (да 80-годдзя прафесара Г. М. Малажай) : зб. навук. арт. : у 2 ч. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; рэдкал.: В. М. Касцючык [і інш.]. – Брэст, 2018. – Ч. 2. – С. 198–203.

18. Тарасава, С. Ідэйна-мастацкая адметнасць гістарычных паэм Юркі Голуба «Знакі», «Карчма» / С. Тарасава // Філалагічнае краязнаўства Гродзеншчыны: матэрыялы і даследаванні : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: М. А. Даніловіч (гал. рэд.), А. Э. Сабуць (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2018. – Вып. 7 : Памяці прафесара Ігара Васільевіча Жука. – С. 278–283.

19. Тарасава, С. Сатырычная плынь у беларускай паэме мяжы XX–XXI стагоддзяў / С. Тарасава // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні: зб. навук. прац. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: А. С. Садоўская (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2019. – С. 127–133.

20. Тарасова, С. Ідэйна-мастацкая своеасаблівасць паэм Генадзя Бураўкіна / С. Тарасова // Человек говорящий, пишущий, читающий в литературе : сб. науч. ст. : в 2 ч. / ГрГУ им. Янки Купалы ; редкол.: Т. Е. Автухович (гл. ред.) [и др.]. – Гродно, 2019. – Ч. 2. – С. 155–164.

21. Тарасава, С. Жанрава-стылёвыя асаблівасці паэм Людмілы Кебіч (на прыкладзе зборніка «Рай для адзіноты») / С. Тарасава // Філалагічнае краязнаўства Гродзеншчыны: матэрыялы і даследаванні : зб. навук. арт. / ГрГУ им. Янки Купалы ; рэдкал.: М. А. Даніловіч, А. Э. Сабуць (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2019. – Вып. 8 : Да 95-годдзя з дня нараджэння прафесара І. Я. Лепешава. – С. 167–173.

22. Тарасава, С. Жанравая адметнасць паэм Міколы Мятліцкага (на прыкладзе зборніка «Чалавек падымае неба») [Электронны рэсурс] / С. Тарасава // Традыцыі Скарыны : зб. навук. арт. / ГДУ імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: А. М. Воінава (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2022. – С. 243–245. – 1 элктрон. апт. дыск.

23. Тарасова, С. Міжжанравыя ўнутрылітаратурныя мадыфікацыі сучаснай беларускай паэмы / С. Тарасова // Stephanos. – 2022. – № 6 (56). – С. 9–22.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

24. Тарасава, С. Купалаўскія традыцыі ў сучаснай беларускай паэме / С. Тарасава // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : матэрыялы навук. канф., Гродна, 3–6 каст. 1995 г. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: І. В. Жук, А. М. Пяткевіч, Т. І. Тамашэвіч. – Гродна, 1996. – С. 97–101.

25. Тарасава, С. Духоўны свет герояў паэм Васіля Зуёнка / С. Тарасава // Literatury i jezyki slowian wschodnich: stan obecny i tendencje rozwojowe : materiały międzynarodowej konferencji naukowej, Opole, 24–26 września 1996 r. : w 2 t. // Uniwersytet Opolski, Instytut Filologii Wschodniosłowiańskiej ; redakcja naukowa : B. Kodzis, S. Kochman, I. Danecka. – Opole, 1997. – T. 1. – S. 106–109.

26. Тарасава, С. Канцэпцыя асобы і часу ў паэмах Васіля Зуёнка / С. Тарасава // Terra Alba : матэрыялы рэсп. навук. канф. «Актуальныя праблемы беларускага літаратуразнаўства», Магілёў, 25–26 сак. 1999 г. / МДУ імя А. А. Куляшова; рэдкал.: Я. І. Клімуць (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2000. – Т. 1 : Праблемы беларускага літаратуразнаўства: да 85-годдзя з дня нараджэння Аркадзя Куляшова. – С. 219–220.

27. Тарасава, С. Фальклорна-міфалагічныя элементы і вобразы ў творчасці Васіля Зуёнка / С. Тарасава // Język, literatura i kultura Slowian: dawniej

i dziś – III : materiały międzynarodowej konferencji naukowej, Poznan, 23–25 września 1999 r. / Uniwersytet im. Adama Mickiewicza ; pod red. B. Zielińskiego. – Poznan, 2001. – S. 255–265.

28. Тарасава, С. Жанр паэмы ў сучаснай беларускай літаратуры (матэрыял для агульнай лекцыі ў XI кл.) / С. Тарасава // Актуальныя праблемы выкладання мовы і літаратуры ў сярэдняй і вышэйшай школе : матэрыялы рэсп. навук. канф., Гродна, 16 крас. 2004 г. / ГрДУ імя Я. Купалы ; рэдкал.: У. І. Каяла (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2004. – С. 178–182.

29. Тарасава, С. Тэма палявання ў творах беларускіх пісьменнікаў паэмнага жанру / С. Тарасава // Гісторыка-тэарэтычныя актуаліі сучаснай філалогіі : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., прысвечанай 70-годдзю з дня нараджэння А. А. Майсейчыка, Брэст, в. Гошчава Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці, 3 ліст. 2006 г. / БрДУ ім. А. С. Пушкіна ; пад агульн. рэд. З. П. Мельнікавай. – Брэст, 2008. – С. 121–125.

30. Тарасава, С. Фальклорная «цытата» ў каноне жанру паэмы / С. Тарасава // Фальклор і сучасная культура : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 22–23 крас. 2008 г. : у 2 ч. / БДУ ; рэдкал.: І. С. Роўда [і інш.]. – Мінск, 2008. – Ч. 1. – С. 173–176.

31. Тарасава, С. Паэмы «Рагвалод» і «Усяслаў Чарадзей» Алеся Разанава: да пытання аб жанравай прыродзе твораў / С. Тарасава // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 21–22 каст. 2010 г. / ВДУ імя П. М. Машэрава ; рэдкал.: Г. А. Арцямёнак (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2010. – С. 221–224.

32. Тарасава, С. Выкладанне твораў паэмнага жанру на ўроках беларускай літаратуры / С. Тарасава // VII рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні : матэрыялы рэсп. навук. канф., г. Брэст, 15 снеж. 2009 г. : у 2 ч. / БрДУ імя А. С. Пушкіна ; рэдкал.: А. С. Кавалюк [і інш.]. – Брэст, 2010. – Ч. 2. – С. 171–175.

33. Тарасава, С. Да пытання аб жанравай прыродзе паэм Яна Чыквіна / С. Тарасава // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemnosci : матэрыялы XVII міжнар. навук. канф., Гродна, 18–19 лістап. 2010 г. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: Г. А. Хацкевіч [і інш.]. – Гродна, 2011. – С. 299–302.

34. Тарасава, С. Тэхналогія перспектыўных ліній пры вывучэнні тэмы мастака і мастацтва ў жанры паэмы / С. Тарасава // Канцэптуальныя падыходы да рэалізацыі зместу філалагічнай адукацыі ў школе і ВНУ : зб. матэрыялаў рэсп. навук. канф., Брэст, 5 крас. 2011 г. / БрДУ імя А. С. Пушкіна ; рэдкал.: У. А. Сенькавец [і інш.]. – Брэст, 2013. – С. 192–197.

35. Тарасава, С. Ідэйна-мастацкія асаблівасці беларускай паэмы пачатку XXI ст. (на матэрыяле часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Дзеяслоў») / С. Тарасова // Куляшоўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф.,

Магілеў, 24–25 крас. 2014 г. / МДУ імя А. А. Куляшова. – Магілёў, 2014. – С. 365–371.

36. Тарасава, С. Арганізацыя навукова-даследчай працы вучняў пры вывучэнні твораў паэмнага жанру / С. Тарасава // Канцэптуальныя падыходы да рэалізацыі філалагічнай адукацыі ў школе і ВНУ : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., прысвечанай 80-годдзю з Дня нараджэння праф. В. Я. Зарэцкай (Ляшук), Брэст, 14 ліст. 2013 г. / БрДУ імя А. С. Пушкіна ; пад агул. рэд. У. А. Сенькаўца. – Брэст, 2015. – С. 228–233.

37. Тарасава, С. Спецыфіка аўтарскага самавыяўлення ў паэмах беларускіх пісьменнікаў Польшчы / С. Тарасава // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemnosci : матэрыялы ХХ міжнар. навук. канф., Гродна, 23–24 кастр. 2014 г. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: Я. А. Панькоў, В. А. Апановіч, Д. С. Томчык, В. Я. Панькова, В. Л. Варановіч, С. У. Амелька. – Мінск, 2015. – С. 147–153.

38. Тарасава, С. Жанравыя асаблівасці паэм Яўгеніі Янішчыц / С. Тарасава // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце : матэрыялы II рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 19–20 ліст. 2015 г. / ВДУ імя П. М. Машэрава ; рэдкал.: Г. А. Арцямёнак (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2015. – С. 251–256.

39. Тарасава, С. Гісторыя беларускай паэмы ў даследаваннях літаратуразнаўцаў / С. Тарасава // Жанравая дынаміка і вобразны свет беларускай літаратуры ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя: зб. матэрыялаў Рэсп. навук.-практ. канф., прысвеч. 100-годдзю з дня нараджэння Янкі Брыля і 95-годдзю з дня нараджэння У. Калесніка, Брэст, 26 каст. 2017 г. / БрДУ імя А. С. Пушкіна ; пад агул. рэд. У. А. Сенькаўца. – Брэст, 2018. – С. 181–184.

40. Тарасава, С. Жанравая адметнасць сучаснай беларускай паэмы пра вайну / С. Тарасава // Беларуская гістарычная літаратура: жанры, характары, праблемы (да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага) : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 22–23 сак. 2018 г. / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Ін-т літаратуразнаўства імя Я. Купалы ; уклад. А. А. Манкевіч. – Мінск, 2018. – С. 79–85.

41. Тарасава, С. Жанравая своеасаблівасць сучаснай гістарычнай паэмы / С. Тарасава // Дзясятыя Калеснікаўскія чытанні: зб. матэрыялаў Рэсп. навук.-практ. канф., Брэст, 18 кастр. 2018 г. / БрДУ імя А. С. Пушкіна ; пад агул. рэд. Л. В. Леванцэвіч. – Брэст, 2019. – С. 67–73.

42. Тарасава, С. Да пытання аб жанравых асаблівасцях паэм Міколы Пракаповіча / С. Тарасава // Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Брэст, 20 лістап. 2019 г. / БрДУ імя А. С. Пушкіна ; пад агул. рэд. Л. В. Леванцэвіч.– Брэст, 2020. – С. 22–26.

43. Тарасава, С. Аб некаторых асаблівасцях жанру паэмы ў творчасці Васіля Макарэвіча / С. Тарасава // XI Калеснікаўскія чытанні : зб. матэрыялаў Рэсп. навук.-практ. канф., Брэст, 29 кастр. 2020 г. / БрДУ імя А. С. Пушкіна ; пад агул. рэд. З. П. Мельнікавай. – Брэст, 2021. – С. 93–97.

44. Тарасава, С. Жанрава-стылёвыя асаблівасці паэм Алега Лойкі мяжы XX – пачатку XXI ст. / С. Тарасава // Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канферэнцыі, Брэст, 17 лістап. 2021 г. / БрДУ імя А. С. Пушкіна ; рэдкал.: З. П. Мельнікава (адк. рэд.) [і інш.]. – Брэст, 2022. – С. 105–109.

**Артыкулы ў іншых выданнях**

45. Тарасава, С. Які ён, беларускі нацыянальны эпас? / С. Тарасава // Літаратура і мастацтва. – 2013. – № 42. – 25 каст. – С. 4.

46. Тарасава, С. Лірычнае адступленне / С. Тарасава // Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. / рэдкал.: В. В. Калістратава (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – Т. 5 : Л–М. – С. 109–110.

47. Тарасава, С. Лірычная паэма / С. Тарасава // Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. / рэдкал.: В. В. Калістратава (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – Т. 5 : Л–М. – С. 110.

48. Тарасава, С. Ліра-эпічная паэма / С. Тарасава // Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. / рэдкал.: В. В. Калістратава (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – Т. 5 : Л–М. – С. 118.

# РЭЗЮМЭ

Тарасава Святлана Мікалаеўна

**Жанравая дынаміка і тыпалогія беларускай паэмы**
**канца XX - пачатку XXI стст.**

**Ключавыя словы:** паэма, жанр, жанравыя мадыфікацыі, лірычная паэма, ліра-эпічная паэма, драматычная паэма, некананічная паэма, эксперыментальная паэма, лірычны герой, сучасны літаратурны працэс, новая літаратурная сітуацыя.

**Мэта даследавання:** устанавіць заканамернасці развіцця і функцыянавання жанру беларускай паэмы канца XX – пачатку XXI стагоддзя, распрацаваць удакладненую жанравую тыпалогію.

**Метады даследавання:** гісторыка-генетычны, параўнальна-тыпалагічны метады, задзейнічаны герменеўтычныя падыходы, элементы структурнага аналізу твора, сістэмна-функцыянальны метад даследавання.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.**

Работа з'яўляецца сучасным наватарскім даследаваннем жанру паэмы пасля выхаду апошніх грунтоўных прац М. Лазарука, М. Арочкі ў 70-я гады XX стагоддзя. У рабоце ўпершыню распрацавана комплексная мадэль крытэрыяў (КМК) сучаснай беларускай паэмы. Упершыню ўстаноўлена жанравая тыпалогія, даследавана паэтыка твораў паэмнага жанру беларускай літаратуры канца XX – пачатку XXI стагоддзя, вызначаны эстэтычна-жанравыя заканамернасці і дамінанты; упершыню ў айчынным літаратуразнаўстве выяўлены і ахарактарызаваны жанравыя формы некананічных і эксперыментальных узораў сучаснай паэмы, распрацавана класіфікацыя жанравых відаў сучаснай беларускай паэмы; упершыню абгрунтаваны яе унутрылітаратурныя і фальклорна-літаратурныя міжжанравыя мадыфікацыі. Дысертант прапануе для далейшай рэалізацыі айчыннаму літаратуразнаўству ўласныя тэрміналагічныя азначэнні: *лірыка-наратыўная паэма, наратыўна-маналагічная паэма, ролева-маналагічная паэма, міфалагічна-рамантычная паэма, умоўна-гістарычная паэма.*

**Рэкамендацыі па выкарыстанні і галіна прымянення атрыманых вынікаў.**

Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны ў якасці тэарэтычнага і практычнага матэрыялу пры выкладанні літаратуры, стварэнні навучальных дапаможнікаў па гісторыі беларускай літаратуры і тэорыі літаратуры, напісанні курсавых і дыпломных прац, падрыхтоўцы навукова-метадычных дапаможнікаў для філалагічных факультэтаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Матэрыялы даследавання могуць стаць асновай факультатыўнага курса «Беларуская паэма» па беларускай літаратуры ў школе, спецкурсаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі.

# РЕЗЮМЕ

Тарасова Светлана Николаевна

**Жанровая динамика и типология белорусской поэмы конца XX-начала XXI вв.**

**Ключевые слова:** поэма, жанр, жанровые модификации, лирическая поэма, лиро-эпическая поэма, драматическая поэма, неканоническая поэма, экспериментальная поэма, лирический герой, современный литературный процесс, новая литературная ситуация.

**Цель исследования**: установить закономерности развития и функционирования жанра белорусской поэмы конца XX – начала XXI века, разработать уточненную жанровую типологию.

**Методы исследования**: историко-генетический, сравнительно-типологический методы, задействованы герменевтические подходы, элементы структурного анализа произведения, системно-функциональный метод исследования.

**Полученные результаты и их новизна.**

Работа является современным новаторским исследованием жанра поэмы после выхода фундаментальных работ М. Лазарука, М. Арочки в 70-я годы XX ст. В работе впервые разработана комплексная модель критериев (КМК) жанровой типологии современной белорусской поэмы. Впервые установлена жанровая типология, проведена классификация, исследована поэтика произведений поэмного жанра белорусской литературы конца XX – начала XXI в., определены эстетически-жанровые закономерности и доминанты; впервые в отечественном литературоведении выявлены и охарактеризованы жанровые формы неканонических и экспериментальных форм современной поэмы, разработана классификация жанровых видов современной белорусской поэмы; впервые обоснованы ее внутрилитературные и фольклорно-литературные межжанровые модификации.

Диссертант предложил для дальнейшей реализации отечественному литературоведению собственные терминологические определения: лирико-нарративная поэма, нарративно-монологическая поэма, ролево-монологическая поэма, мифолого-романтичная поэма, условно-историческая поэма.

**Рекомендации по использованию и область применения полученных результатов.**

Материалы диссертационного исследования могут быть использованный в качестве теоретического и практического материала при преподавании литературы, создании учебных пособий по истории белорусской литературы и теории литературы, написании курсовых и дипломных работ, подготовке учебно-методических пособий для филологических факультетов высших учебных заведений Республики Беларусь. Материалы исследования могут стать основой факультативного курса «Беларуская паэма» по белорусской литературе в школе, спецкурсов в учреждениях высшего образования.

## SUMMARY

Sviatlana Tarasava

**Genre Dynamics and Typology of the Belarusian Poem of the Late XX - Early XXI Centuries**

**Keywords:** genre thinking, genre typology, genre canon, lyrical poem, lyric-epic poem, dramatic poem, non-canonical poem, experimental poem, concept, motive, literary hero, poetics, modern literary process, new literary situation.

**The aim of the research:** to establish the regularities of development and functioning of the genre of the Belarusian poem of the late XX-early XXI centuries, to develop a refined genre typology.

**The methods of the research:** historical-genetic and comparative-typological methods, hermeneutical approaches, the elements of structural analysis of the work, system-functional method.

**The results obtained and their novelty.** The work is a modern innovative study of the genre of the poem after the release of the fundamental works of M. Lazaruk, M. Arochka in the 70s of the twentieth century. The comprehensive model of criteria (CMC) of the genre typology of the modern Belarusian poem has been developed for the first time. The genre typology was established for the first time, the classification was carried out, the poetics of the works of the poetic genre of Belarusian literature of the late XX – early XXI centuries was investigated, the aesthetic and genre patterns and dominants were determined; the classification of synthesized genre forms of modern Belarusian poems was developed for the first time in Russian literary criticism, the genre models of non-canonical and experimental samples of modern poems were identified and characterized for the first time; their intra-literary and folklore-literary inter-genre modifications were justified. The dissertation candidate proposed her own terminological definitions for further implementation in Russian literary criticism: a lyric-narrative poem, a narrative-monologue poem, a role-monologue poem, a mythological-romantic poem, a conditional-historical poem.

**The recommendations for the use and the sphere of application of the results obtained.**

The results of the dissertation research can be used as theoretical and practical material in teaching Literature in higher education and general education institutions, when creating textbooks on the history of Belarusian literature and literary theory, when writing term papers and theses, preparing teaching aids for philological faculties of higher education institutions. The research materials can become the basis of the optional course «Belarusian Poem» on Belarusian Literature at school, special courses in higher education institutions.

Падпісана да друку 29.03.2024. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. арк. 1,75.
Тыраж 60 экз. Заказ 80.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.